# ПРАДМОВА

**Бэнджамін Коўп, Павел Няхаеў**

Гэты нумар працягвае працу па аналізе гуку, слухання, сучасных гукавых і музычных культур, якая ідзе ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце ў Вільнюсе. Хоць наш універсітэт стаў адным з піянераў у развіцці візуальных і культурных даследаванняў, пытанні гуку, сучаснай музыкі, музычных супольнасцяў і індустрый таксама часта з'яўляюцца прадметам вывучэння студэнтаў і выкладчыкаў[1]. Даследаванне гукаў і рытмаў гарадскіх прастораў часта становяцца цэнтральнымі элементамі семінараў, летніх школ і іншых праектаў, што адбываюцца пры падтрымцы ЕГУ[2].

Нагодай стварэння гэтага нумара для нас стаў адносны недахоп прац, прысвечаных праблемам гуку і музыкі ў сённяшняй Усходняй Еўропе. Прыкметы таго, што сітуацыя мяняецца, ёсць. Так мяркуюць у сваім інтэрв'ю Міхал Лібэра і Даніэль Музычук, аб гэтым жа сведчаць некалькі нядаўніх расійскіх публікацый[3]. І ўсё ж даследаванні гуку і сучаснай музыкі застаюцца маргіналізаваным заняткам.

Складаючы гэты нумар, мы выкарысталі тэрмін «P.S. Soundscapes», які адсылае да двух паралельных напрамкаў нашых зацікаўленняў. Першы з іх указвае на той факт, што гук у эпоху «візуальнага павароту» часта заставаўся «бедным сваяком» візуальных і культурных даследаванняў. Аднак з сярэдзіны XX стагоддзя гук быў ключавым элементам тран-

---

1 У ЕГУ тэмам гуку, музыкі і музычнай індустрыі прысвечаныя курс «Лабараторыя гуку: гук, музыка і тэхналогіі ў сучаснай культуры» Паўла Няхаева і, у ранейшыя гады, курсы Максіма Жбанкова і Настассі Камароўскай. Гэтыя тэмы выступаюць прадметам шэрагу бакалаўрскіх і магістарскіх даследаванняў і аналізуюцца на курсах нашых калег, якія разглядаюць праблемы гуку і музыкі ў кантэксце даследаванняў сучаснай візуальнай і інтэрнэт-культуры, кіно і медыя, гарадскіх даследаванняў і крэатыўных індустрый альбо ў практычным ключы – на курсах і warштатах па радыё-, відэа- і медыяпрадукцыі.

2 Напрыклад, LitPro Summer School, 2008 (Вільнюс), Jamming Underused Socialist Treasures, 2012 (Вільнюс); Urban Audio-Visual Rhythms Workshop, 2012 (Вільнюс), 2014 і 2016 (Minsk); Sound & Space Workshop, 2014 (Vilnius); Mapping Sounds & Cities, 2017 (Вільнюс); а таксама лекцыі і дыскусіі на штогадовым мастацка-адукацыйным фестывалі Artes Liberales, які з 2012-га ў Мінску арганізуе акадэмічная супольнасць ЕГУ.

3 Некаторыя нядаўнія выпускі часопісаў пра гук на рускай мове: *Новое Литературное Обозрение* (2017) Vol. 148, no. 6: http://nlobooks.ru/node/9056); *Транслит: Музыка революции* (2017) Vol. 20: (http://trans-lit.info/vypuski/20-translit-muzyka-revolyutsii); *Логос: Другая философия музыки* (2016), Vol. 4: http://logosjournal.ru/cgi-bin/arch.pl?lang=ru&action=show&id=88.

сфармацый папулярнай культуры, эксперыментаў на скрыжаванні мастацтва, філасофіі і музыкі, пераасэнсавання адносінаў паміж чалавекам і асяроддзем. Такім чынам, першы сэнс «P.S.» у назве нумара сігналізуе пра важнасць рэфлексіі адносна месца і прыроды гуку ў якасці пастскрыптуму да «прымату» візуальнасці. Падабраўшы артыкулы навукоўцаў, якія працуюць з гукавой праблематыкай, мы імкнемся прадэманстраваць, што даследаванні гуку і слухання здольныя ўзбагаціць і змяніць наша разуменне розных аспектаў жыцця асобы і грамадства.

Другі сэнс «P.S.» звязаны з ідэяй, якую мы развівалі раней у публікацыі па гарадскіх даследаваннях – «P.S. Ландшафты: Оптыкі гарадскіх даследаванняў» (Вільнюс, Выдавецтва ЕГУ, 2008). Тады мы ўжылі абрэвіятуру «P.S.», каб указаць на постсацыялістычны рэгіён і адначасова адзначыць, што мы маем сур'ёзныя агаворкі адносна таго, ці можна акрэсліваць як пэўны рэгіён былыя сацыялістычныя краіны ва Усходняй Еўропе і па-за ёй, і што дакладна ў гэтых прасторах можа быць (ці не быць) постсацыялістычным. Іншымі словамі, другі сэнс «P.S. Soundscapes» пазначае нашу зацікаўленасць у даследаваннях таго, як мысленне пра гук можа праліць новае святло на сённяшнія трансфармацыі ва Усходняй Еўропе і былым СССР. Хаця наша рэфлексія і інспіраваная працамі па акустычнай экалогіі і даследаваннямі гукавых ландшафтаў, наша разуменне гукавога ландшафту ў гэтым нумары шырэйшае, больш метафарычнае, ніж звычайна.

Тэксты нумара прэзентуюць шырокі шэраг праблем, да якіх звяртаюцца гукавыя даследчыкі рэгіёна. У першым раздзеле, «Гук і суб'ектыўнасць», мы сабралі артыкулы, што вывучаюць, як слуханне змяняе разуменне суб'ектыўнасці. Марыя Яшчанка даследуе працу беларускага аўдыямастака Антона Сарокіна праз прызму гуку і псіхааналізу. Яшчанка пастулюе, што гук у працах Сарокіна выяўляе звязаныя з кантэкстам постсацыялістычнай Беларусі нюансы структур, якія палягаюць у аснове працэсу фармавання суб'ектыўнасці. Іна Гладышава аналізуе асаблівую ролю, якую надае гуку авангардны фільммэйкер, эмігрант з Літвы Ёнас Мекас, ствараючы жанр кінадзённіка. Гладышава сцвярджае, што ў стужцы «Уолдэн» выкарыстанне гуку паказвае матэрыяльнасць фільма, укараняе яго ў асяроддзі стварэння і адначасова робіць карціну асабістай і паэтычнай. Андрэй Горных звяртае ўвагу на тое, як культурная логіка позняга капіталізму прывяла да фетышызацыі гуку. Пачаўшы з аналізу наратыўнай функцыі гуку для Таркоўскага і Сартра, Горных даследуе, як культурная фрагментацыя прывяла сёння да таго, што меркаванні аматараў музыкі пераплятаюцца з бізнес-логікай вытворцаў аўдыятэхнікі.

У фокусе другога раздзела – «Музыка і грамадства» – тое, як сацыяльныя праблемы праламляюцца праз гукі. Андрэй Вазьянаў мяркуе, што гукі зменлівых практык мабільнасці могуць быць ключавымі для разумення постсацыялістычных гарадоў. Вазьянаў сцвярджае, што назіранне за гукамі, якія ўзнікаюць, калі інфра-

структуры розных эпох судакранаюцца з новымі транспартнымі практыкамі, – гэта карысны спосаб вывучэння таго, як ў постсацыялістычных грамадствах размяркоўваюцца падзелы між публічным і прыватным. Віта Зяленская праз інтэрв'ю з сучаснымі выканаўцамі высвятляе ролю грэчаскага музычнага жанру «рэбетыка». Праца Зяленскай важная тым, што дадае нумару перспектыву музычнай сацыялогіі, а таксама даследуе складаныя дачыненні паміж гэтай музыкай і грэчаскай ідэнтычнасцю ў часы эканамічнага і палітычнага крызісу. У той жа час Дзмітрый Кашлакоў і Анатоль Сцепанішчаў даследуюць адносіны гуку і грамадства праз троп бяспекі, паказваючы шэраг палёў, дзе вывучэнне гуку можа ўзбагаціць разуменне сучасных грамадстваў.

Нумар працягвае серыя тэкстаў, якія пашыраюць кантэкст разваг пра «P.S. Soundscapes». Ганс-Ульрых Гумбрэхт абмяркоўвае музыку ў працэсе пераасэнсавання ролі «Stimmung», настрою ці атмасферы, у якасці ключавога тропу сучасных гуманітарных даследаванняў. Два кароткія эсэ, якія мы публікуем, прэзентуюць філасофскае даследаванне музыкі як стваральніцы настрою, а таксама «ўважлівае чытанне» эпахальнай значнасці голасу Джэніс Джоплін. Тэарэтыкі гуку і куратары Міхал Лібэра і Даніэль Музычук у сваім інтэрв'ю абмяркоўваюць кантэкст даследаванняў гуку ў сённяшняй Польшчы. Завяршаюць нумар два эсэ. Марцін Барскі піша пра значэнне гукаў, якія ён знайшоў на аматарскіх касетных запісах, зробленых у Польшчы ў 1980-х. Барскі разважае аб тым, што пра постсацыялістычныя трансфармацыі могуць расказаць змены ў патэрнах практыкі гуказапісу і сабраныя такім чынам гукі (альбом з якімі ён сёлета выдасць). Нарэшце, Аляксандр Сарна прапануе правакатыўны аповед пра містычны фанетычны знак у Мінску. Гэты дзіўны і няўлоўны фанетычны мэсэдж стымулюе Сарну на рэфлексію адносна палітычных наступстваў рэгулявання фонасферы.

Рэдактары вельмі ўдзячныя за працу і цярпенне як аўтарам, так і ўсім, хто дапамагаў у стварэнні нумара. Асабліва мы хочам падзякаваць ананімным рэцэнзентам за змястоўныя і ўзважаныя водгукі на тэксты аўтараў. Мы таксама глыбока ўдзячныя Ксеніі Шталенковай, навуковай сакратарцы часопіса «Топас», за яе адданую і добрасумленную працу, якая не дазволіла праекту пайсці пад адхон. Мы таксама хочам падзякаваць Таццяне Шчытцовай за публікацыю тэкстаў Ганса-Ульрыха Гумбрэхта і за прадмову да іх, а таксама іншым калегам па ЕГУ за ўнёсак у абмеркаванне і падрыхтоўку гэтага праекта. Мы ўдзячныя нашым блізкім, сем'ям і сябрам, якія падтрымлівалі нас, выслухваючы самыя розныя шумы, што ўзнікалі пры працы над гэтым праектам. Без іх мы б не далі рады. Мы спадзяемся, што гэтая публікацыя стане невялічкім крокам да яшчэ большай працы над «P.S. Soundscapes».

# INTRODUCTION

**Benjamin Cope, Pavel Niakhayeu**

This volume constitutes a continuation of the work done in the exploration of sound and listening, and of contemporary sound and musical cultures at the European Humanities University in Vilnius. Although our university has been a pioneer in developing the discipline of visual and cultural studies, questions of sound, contemporary music, music communities and music industries have also been a frequent subject of investigation by both students and lecturers[1]. Investigations of sounds and rhythms of urban spaces also frequently emerge as central elements of seminars, summer schools and other projects that take place with the university's support[2].

The motivation for such a volume was, in our view, the relative dearth of research exploring the problematics of sound and music in today's Eastern Europe. While, as Michał Libera and Daniel Muzyczuk discuss in interview in this volume with regard to Poland and some recent publications in Russia also testify, there are signs that this is changing, research into sound and contemporary music remains a marginalised preoccupation[3].

In composing this volume, we used the term «P.S. Soundscapes» to refer to two parallel axes of our interests. The first was to gesture to the fact that sound, in the age of the «visual turn» often remains a «poor cousin» of visual and cultural studies. How-

1 The themes of sound, music and music industry have been explored at EHU in the course: «SoundLab: Sound, Music and Technologies in Contemporary Cultures» by Pavel Niakhayeu, and – in previous years – in courses by Maksim Zhbankou and Anastasia Komarovskaya. These themes have also been the subject of theses at masters' and bachelors' levels, and investigated in the courses of colleagues who deal with questions of sound and music as part of research into contemporary visual and internet cultures, film\media studies, urban studies, studies of creative industries, or in a practical vein as part of courses and workshops in radio, video and media production.

2 For example: LitPro Summer School, 2008; Jamming Underused Socialist Treasures, 2012; Urban Audio-Visual Rhythms Workshop, 2012 (Vilnius), 2014 and 2016 (Minsk); Sound & Space Workshop, (2014, Vilnius); Mapping Sounds & Cities (2017, Vilnius); and in lectures and discussions at the annual artistic-educational festival Artes Liberales organized in Minsk by the academic community of EHU since 2012.

3 Recent journal issues about sound in Russian include: *Новое Литературное Обозрение* (2017) Vol. 148, no. 6: http://nlobooks.ru/node/9056); *Транслит: Музыка Революции* (2017) Vol. 20: (http://trans-lit.info/vypuski/20-translit-muzyka-revolyutsii); *Логос: Другая философия музыки* (2016), Vol. 4: http://logosjournal.ru/cgi-bin/arch.pl?lang=ru&action=show&id=88

ever, from the middle of the 20th century, sound has been a key element in transformations in popular culture, in experiments at the crossroads of art, philosophy and music, and in a reappraisal of relations between humans and the environment. As a result, the first sense of «P.S.» in the title of our volume is that of signalling an importance of a reflection on the place and nature of sounds as a post-scriptum to the «primacy» of the visual. By gathering articles by scholars from the region working on sound, we aim to demonstrate how research into sound and listening can enrich and transform our understanding of various aspects of individual and social life.

The second sense of «P.S.» relates to an idea that we previously developed in a publication dedicated to urban studies, *P.S. Landscapes: Optics of Urban Studies* (Vilnius: EHU Publishing House, 2008). Then, we used the abbreviation P.S. both to gesture to the post-socialist region, and at the same time to indicate that we have serious reservations both about whether the former socialist countries of Eastern Europe and beyond can be termed a region, and what precisely might or might not be post-socialist about these spaces. In other words, the second sense of «P.S. Soundscapes» indicates that we are interested in exploring how thinking about sound can shed new light on current transformations in Eastern Europe and the former USSR. Although our reflection draws inspiration from the work of acoustic ecology and soundscape studies, the understanding of soundscapes in this volume is broader, more metaphorical, than usually the case.

The texts in this volume represent a wide range of issues of concern to scholars dealing with sounds in the region. In the first section, «Sound and Subjectivity», we group a number of texts exploring how listening can inflect understandings of subjectivity. Maria Yashchanka explores the work of Belarusian artist Anton Sarokin through a consideration of sound and psychoanalysis. Yashchanka posits that sound in Sarokin's art reveals underlying structures in the process of subjectivity formation, as nuanced in the context of post-socialist Belarus. Ina Hladyshava explores the specific role of sound as used by Lithuanian émigré, avant-garde filmmaker Jonas Mekas' in creating the genre of «diary film». Hladyshava argues that in the film *Walden* sound is used to reveal the materiality of film and embed it in the environment of its making, while also rendering the film personal and poetic. Andrei Gornykh, meanwhile, turns his attention to how the cultural logic of late capitalism has produced a fetishisation of sound. Starting from an analysis of the narrative function of sound in Tarkovsky and Sartre, Gornykh explores how cultural fragmentation has today led to the opinions of music lovers becoming intertwined with the business logics of producers of musical equipment.

The focus of the second section, «Music and Society», is on how social issues are refracted through sounds. Andrey Vozyanov considers that sounds of changing mobility practices can offer key insights into post-socialist cities. Vozyanov argues that tracking the sounds produced as infrastructures from different epochs come together with new trans-

port practices provides a useful avenue for exploring how public/private divides are being negotiated in post-socialist societies. Vita Zelenska examines the role of rebetiko through interviews with its contemporary performers. Zelenska's work is valuable for bringing a sociology of music perspective to our volume, and also for exploring the complex relations between this musical genre and Greek identity at a time of economic and political crisis. Dmitry Koshlakov and Anatoly Stepanishchev, meanwhile, explore the relations between sound and society through the trope of security. In so doing, they reveal a variety of fields where investigating sounds can enrich understandings of contemporary societies.

The volume continues with a series of contributions that expand contexts for thinking about P.S. Soundscapes. Hans Ulrich Gumbrecht discusses music as part of rethinking the role of «Stimmung», mood or atmosphere, as a key trope in the contemporary humanities. The two short essays included here present a philosophical exploration of music as a maker of mood and a close reading of the epochal significance of the voice of Janis Joplin. In interview, sound theorists and curators Michał Libera and Daniel Muzyczuk discuss the context of research on sound in today's Poland. The volume closes with two essays. Marcin Barski discusses the significance of the sounds he has found on cassettes home-recorded in Poland in the 1980s. Barski meditates on what changing patterns of sound recording and the sounds thus gathered, which he will release as an audio-work later in the year, can reveal about post-socialist transformation. Finally, Aleksandr Sarna offers a provocative account of a mysterious phonetic sign in Minsk. For Sarna, this strange and fleeting phonemic message offers stimulation to reflect on the political implications of the regulation of the phonosphere.

The editors are very grateful for the work and patience both of the authors and of all others who have contributed to this volume. In particular, we would like to thank the anonymous reviewers for their insightful and considered responses to authors' texts. We are also very grateful to Ksenya Shtalenkova, secretary of the Topos journal, for her willing and conscientious work in keeping this project on track. We would also like to thank Tatiana Shchyttsova for organising the publication of and writing the introduction to Hans Ulrich Gumbrecht's texts, and other colleagues at EHU for their contribution to the development of our ideas and the preparing of this project. We also wish to thank those close to us, our families and friends, who are willing to listen supportively to the various noises generated during work on a project such as this: without them, it would not have been possible. We hope that this publication can be a modest step towards generating more work on and in «P.S. Soundscapes».